ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА"

АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ
І ПРАБЛЕМ КУЛЬТУРЫ

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

(Інфармацыйнае паведамленне)

Чэрвень, 2010 г.

Віцебск
2010

УДК 008

ББК 71.41 (4Беи – 4Вит)

К 90

Складальнік Н.А. Пугачова

Рэдактар В.М. Нявейкава

Камп'ютарная вёрстка Н.А. Пугачова

Адказны за выпуск А.І. Сёмкін

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : інфармацыйнае паведамленне / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна", Аддзел бібліятэказнаўства, навуковых даследаванняў і праблем культуры; [склад. Н.А. Пугачова]. – Віцебск, 2010. – 22 с.

© ДУ«Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», 2010

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

2010 г.

Складальнік Н.А. Пугачова

Рэдактар В.М. Нявейкава

Камп'ютарная вёрстка Н.А. Пугачова

Адказны за выпуск А.І. Сёмкін

Надрукавана на ксераксе

ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

210601, Віцебск, Леніна, 8-а

E-mail: vlib@vlib.by

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА 4

РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ 5

РАЗДЗЕЛ 2. КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА 5

- КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ 5
- КУЛЬТУРНЫ ТУРЫЗМ 6
- КЛУБНАЯ СПРАВА 7
- ФЕСТЫВАЛІ, КОНКУРСЫ 7
- САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ 9
- БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА 11
- МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ 15

РАЗДЗЕЛ 3. МАСТАЦТВА 16

- ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА 16
- ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ 19

РАЗДЗЕЛ 4. МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК 19

РАЗДЗЕЛ 5. ІНФАРМАЦЫЯ АБ НЕГАТЫЎНЫХ З'ЯВАХ І НЕДАХОПАХ У ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ ВОБЛАСЦІ (па матэрыялах абласных, гарадскіх і раённых газет) 20

ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Матэрыялы паведамлення ўключаюць тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 па 31 чэрвеня. Інфармацыя за чэрвень, якая не знайшла свайго адлюстравання ў бягучым выпуску, будзе размешчана ў чарговым выданні ў раздзеле “Мерапрыемствы, якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск”.

Інфармацыйнае паведамленне таксама ўтрымлівае звесткі, атрыманыя з Віцебскага АМЦНТ, аддзела культуры Міёрскага райвыканкама, Віцебскай і Полацкай гарадскіх ЦБС, Браслаўскай, Полацкай, Ушацкай, Шумілінскай раённых ЦБС.

Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных і музейных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

райисполкома поднимается вопрос о недостатках в организации и проведении фестиваля сельского туризма “Заборскі фэст”.

3. Подлипский, А. Доски надо заменить / А. Подлипский // Витебский проспект. – 2010. – 10 июня. – С. 6.

В статье идет речь о необходимости замены мемориальных (памятных) досок, которые размещены на здании железнодорожного вокзала.

22-26 мая ў Музеі Марка Шагала ў г. Віцебску прайшоў семінар для студэнтаў Інстытута Славістыкі ўніверсітэта г. Рэгенсбурга (Германія).

(Віцебскі АМЦНТ)

28 мая заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь харэаграфічны ансамбль "Зорка" ЦК "Віцебск" выступіў на першым Міжнародным дабрачынным фестывалі дзіцячай і юнацкай творчасці "Солнечный каштанчик" у г. Кіеве (Украіна).

(Віцебскі АМЦНТ)

У маі навучэнцы Наваполацкай ДМШ прынялі ўдзел у VI Маскоўскім Міжнародным фестывалі славянскай музыкі (г. Масква).

(Віцебскі АМЦНТ)

РАЗДЗЕЛ 5

ІНФАРМАЦЫЯ АБ НЕГАТЫЎНЫХ З'ЯВАХ І НЕДАХОПАХ У ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ ВОБЛАСЦІ

(па матэрыялах абласных, гарадскіх і раённых газет)

1. **Болсуновская, Н.** Латышский след в истории Городокщины / Н. Болсуновская // Гарадоцкі веснік. – 2010. – 22 чэрв. – С. 2.

О католическом храме в д. Ремни, внесенном в государственный список историко-культурного наследия Республики Беларусь, требующем реконструкции, и бывшем молитвенном доме в д. Поташня Городокского района.

2. **Гвоздева, И.** Нет главного - сельского туризма / И. Гвоздева // Голас Расоншчыны. – 2010. – 22 чэрв. – С. 2.

В статье начальника идеологической работы Россонского

РАЗДЗЕЛ 1

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

1 чэрвеня ў Наваполацку адбылася цырымонія ўручэння прэмій таленавітым дзецям і моладзі ў сферы культуры і мастацтва.

(Новая газета (Наваполацк). – 2010. – 3 июня. – С. 1.)

У Полацку прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя 100-годдзю перанясення святых мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай з г. Кіева. Да знамянальнай падзеі былі прымеркаваны фотавыстава "Незабвенные дни", міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, фестывалі праваслаўнай творчасці і духоўна-патрыятычных кінафільмаў. Кульмінацыяй юбілейных урачыстасцей стаў Дзень памяці, **5 чэрвеня**, калі ў Полацку сабраліся тысячы паломнікаў, якія прыйшлі і прыехалі пакланіцца машчам прападобнай Еўфрасінні.

(Народнае слова. – 2010. – 8 чэрв. – С. 1.)

25-26 чэрвеня ў рамках святкавання Дня горада "Віцебску – 1036 гадоў" прайшло больш за 40 культурна-забаўляльных мерапрыемстваў.

(Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 13.)

РАЗДЗЕЛ 2

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА

- **КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ**

З **28 мая** па **1 чэрвеня** ў г. Алматы (Казахстан) прайшоў XII Міжнародны конкурс дзіцячай творчасці "Бозторгай". Лаўрэатам першай прэміі стаў саліст народнага тэатра песні і музыкі "Просторы" ДУ "Цэнтр культуры "Віцебск" *Максім Пісарэнка.*

(Віцебскі АМЦНТ;

Витебский проспект. – 2010. – 3 июня. – С. 4.)

4-6 чэрвеня заслужаныя аматарскія калектывы Рэспублікі Беларусь харэаграфічны ансамбль “Зорка” і ансамбль танца “Лявоніха” ЦК “Віцебск” прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах да Дня горада Даўгаўпілса (Латвія).

(Віцебскі АМЦНТ)

11-13 чэрвеня народны ансамбль народнай музыкі і песні “Сябрына” Цэнтра рамёстваў і мастацтваў “Дзвіна” г. Віцебска паспяхова высупіў на V фестывалі нацыянальных культур ў г. Рэзекне (Латвія).

(Віцебскі АМЦНТ)

16 чэрвеня народная студыя эстрадных шоў-праграм “Он лайн” ДК ААТ “Нафтан” у складзе дэлегацыі прадставіла г. Наваполацк на святкаванні Дня горада Жывар (Францыя).

(Віцебскі АМЦНТ)

На XI Усерасійскім конкурсе дзіцячай песні “Камертоша”, які прайшоў у рэспубліцы Мары-Эл, лаўрэатам трэцяй прэміі стаў *Арцём Карніцкі* з г.п. Багушэўск (Сенненскі раён).

(Народнае слова. – 2010. – 22 чэрв. – С. 1.)

- **КУЛЬТУРНЫ ТУРЫЗМ**

5-6 чэрвеня ў Расонскім раёне адбыўся рэспубліканскі фестываль сельскага турызму **“Заборскі фэст”**, які распачаўся першым на Беларусі конным святам. Другі этап фестывалю прайшоў **12-13 чэрвеня**, яго праграму склалі прэзентацыя турыстычных маршрутаў і аграэкасядзіб раёна, традыцыйны кірмаш рамесніцкіх вырабаў і народных страў хатняга гатунку, тэатралізаванае прадстаўленне, канцэрт і іншыя мерапрыемствы.

(Народнае слова. – 2010. – 3 чэрв. – С. 1.;

Народнае слова. – 2010. – 19 чэрв. – С. 5.;

Голас Расоншчыны. – 2010. – 8 чэрв. – С. 1.;

Голас Расоншчыны. – 2010. – 18 чэрв. – С. 1.;

“Смаленскі каўчэг”, які з **23** па **28 чэрвеня** праходзіў у Смаленску. Спектакль “Прывітанне, Альберт!”, пастаўлены Віталем Баркоўскім па п’есе Ю. Сохара да 170-годдзя А. Энштэйна, адзначаны дыпломам і прызам “За лепшую рэжысуру”.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 6 июля. – С. 2.)

Беларускі тэатр “Лялька” прыняў удзел у лялечным фэсце ў г. Субоціца (Сербія). Актрыса тэатра *Вольга Маханькова* атрымала прыз за лепшае выкананне жаночай ролі ў спектаклі “Хлопчык-зорка” па творчасці А. Уайльда.

(Витебский проспект. – 2010. – 10 июня. – С. 6.)

РАЗДЗЕЛ 4

МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

З **5** па **9 мая** народны клуб гістарычнай рэканструкцыі **“**Варгенторн**”** ЦК “Віцебск” прыняў удзел у Міжнародным маладзёжным фестывалі гістарычнай рэканструкцыі “Русбор”, які праходзіў у Ліпецкай вобласці (г. Ялец, Расія).

(Віцебскі АМЦНТ)

З **7** да **26 мая** ў выставачнай зале АМЦНТ працавала выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прысвечаная 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне “Майстры Віцебшчыны Вялікай Перамозе”. У экспазіцыі былі прадстаўлены лепшыя творы сучаснага народнага мастацтва майстроў Віцебшчыны: ткацтва, вышыўка, ганчарства, разьбярства, саломапляценне, лазапляценне, апрацоўка скуры, выцінанка, рэканструкцыя народнага аддзення, маляванка і інш.

(Віцебскі АМЦНТ)

прысвечаная 55-годдзю мастака.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 22 июня. – С. 2.;

Витебский проспект. – 2010. – 10 июня. – С. 6.)

Выставачная зала Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва запрасіла на ўрачыстае адкрыццё выставы “Партрэт горада”, у якой прынялі ўдзел члены Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў.

(Віцебскі рабочы. – 2010. – 29 чэрв. – С. 5.;

Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 23.)

Падарожжа па Крыму прапанаваў віцебскі мастак *Леанід Радзевіч* на выставе “Крымскі альбом”, што адкрыта ў малой зале Цэнтра сучаснага мастацтва.

(*Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 23)*

У Мастацкім музеі г. Віцебска прадстаўлена выстава беларускага графіка *Валерыя Славука* “Персанажы беларускіх міфаў, легенд і паданняў”.

(Витебский проспект. – 2010. – 10 июня. – С. 6.)

“Край мой мілы, край мой беларускі” – пад такой назвай у Аршанскім ГЦК прайшла персанальная выстава жывапісу мастака, паэта *Барыса Цімафеевіча Літаровіча*.

(Аршанская газета. – 2010. – 12 чэрв. – С. 3.)

Выстава жывапісу і графікі *Алены Гушчонак* і *Ганны Прашковіч* “На даху” адкрылася ў Цэнтры культуры г. Глыбокае.

(Веснік Глыбоччыны. – 2010. – 5 чэрв. – С. 6.)

У Глыбоцкім гарадскім Цэнтры культуры была адкрыта выстава “Каляровы свет”, на якой сваю творчасць прадставілі навучэнцы Глыбоцкай дзіцячай мастацкай школы імя Я. Драздовіча.

(Веснік Глыбоччыны. – 2010. – 16 чэрв. – С. 5.)

- **ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ**

Падведзены вынікі Міжнароднага тэатральнага фестывалю

Рэжым доступу:

http://vitebsk-region.gov.by/ru/news/culture?mode=one_new&id=3814. –

Дата доступу: 01.07.2010 г.)

- **КЛУБНАЯ СПРАВА**

З **21** па **26 чэрвеня** на базе ДУ “Абласныя курсы павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры” адбыліся абласныя курсы дырэктараў сельскіх дамоў культуры.

(Віцебскі АМЦНТ)

19 чэрвеня ў Докшыцкім цэнтры культуры прайшла канферэнцыя, прысвечаная духоўнаму выхаванню школьнікаў на праваслаўных традыцыях, удзельнікамі якой сталі педагогі і бібліятэкары раёна. Праграма канферэнцыі ўключыла выступленне епіскапа Полацкага і Глыбоцкага Феадосія, аўтара серыі кніг пра праваслаўе Барыса Ганага (Мінск), паказ тэматычнага фільма, а таксама асвячэнне кіота ў гонар св. Кірыла і Мяфодзія на тэрыторыі Докшыцкай СШ № 1.

(Народнае слова. – 2010. – 19 чэрв. – С. 2.)

- **ФЕСТЫВАЛІ, КОНКУРСЫ**

4-6 чэрвеня ў Гродна адбыўся **VIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур**. Прадстаўнікі 8 нацыянальнасцей з Віцебскай вобласці атрымалі дыпломы лаўрэатаў фестывалю ў розных намінацыях. Гран-пры конкурсу выканаўцаў эстраднай песні атрымаў прадстаўнік Віцебскай гарадской арганізацыі “Родислав” з Полацка *Анатоль Пашчанка*.

(Віцебскі АМЦНТ;

Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 3 июня. – С. 1.;

Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 12 июня. – С. 11.;

Рэжым доступу:

http://vitebsk-region.gov.by/ru/news/culture?mode=one_new&id=3842. –

Дата доступу: 01.07.2010 г.)

10 чэрвеня ў Цэнтры культуры “Віцебск” адбыўся **III адкрыты гарадскі конкурс выканаўцаў рускай музыкі і песні “Горад княгіні Вольгі”**, прысвечаны 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У фінале конкурсу выступілі 25 індывідуальных выканаўцаў і калектываў з Віцебска, Оршы, Полацка, Наваполацка, г.п. Шуміліна і Віцебскага раёна, якія прынялі ўдзел у наступных намінацыях: “Руская народная песня”, “Народная мелодыя”, “Эстрадная песня”. Дыплом уладальніка Гран-пры ўручаны інструментальнаму дуэту з Віцебскага музычнага каледжа імя І. Салярцінскага ў складзе *Рамана Поста* і *Леаніда Спірыдонава*.

(Віцебскі АМЦНТ)

12-13 чэрвеня пад сценамі Полацкага Сафійскага сабора прайшоў трэці фестываль сярэднявечнай культуры **“Рубон”**, прысвечаны 1148-годдзю г. Полацка і 600-годдзю перамогі продкаў у Грунвальдскай бітве.

(Народнае слова. – 2010. – 17 чэрв. – С. 2.;

Віцебскі рабочы. – 2010. – 12 чэрв. – С. 4.;

Полацкі веснік. – 2010. – 18 чэрв. – С. 3.;

Рэжым доступу:

http://vitebsk-region.gov.by/ru/news/culture?mode=one_new&id=3847. –

Дата доступу: 01.07.2010 г.)

25-27 чэрвеня ў г. Дуброўне прайшоў **XVII Міжнародны фестываль песні і музыкі Падняпроўя Расіі, Беларусі і Украіны “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”**. Праграма фестывалю ўключыла канцэрт-прэзентацыю калектываў–удзельнікаў, свята горада “Горад старажытны, вечна малады”, кірмаш рамёстваў, выставу-конкурс “Дубравушка”, агляд-конкурс юных выканаўцаў народнай песні і музыкі “Дняпроўскія галасы”, мітынг-рэквіем у мемарыяльным комплексе “Рыленкі” і інш. У фестывалі прынялі ўдзел вакальны калектыў “Ластаўкі” Беларускага культурнага таварыства “Уздым” г. Даўгаўпілс (Латвія), ансамбль “Світанак” Беларускага культурнага цэнтра “Крок” г. Вісагінас (Літва), ансамбль народнай песні “Любава” Цэнтра рускай культуры г. Талін (Эстонія), тэатр народнай песні і танца Смаленскага

дзяржавы Ізраіль ў Рэспубліцы Беларусь *Эдуард Шапіра*.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 22 июня. – С. 2.;

Витебский проспект. – 2010. – 17 июня. – С. 23.;

Народнае слова. – 2010. – 22 чэрв. – С. 2.)

22 чэрвеня ў Цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў “Дзвіна” была адкрыта выстава графікі *Аляксандра Раманава* і фларыстыкі *Галіны Грышанавай* пад назвай “Кветкі і анёлы”.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 26 июня. – С. 6.)

22 чэрвеня ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі афармлена выстава дзіцячых малюнкаў “Пад адным сонцам”, арганізаваная па выніках конкурсу, аб’яўленага Міністэрствам адукацыі РБ і Прадстаўніцтвам УВКБ ААН да Сусветнага дня бежанцаў.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 29 июня. – С. 2.;

(Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 23.)

24 чэрвеня ў выставачнай зале дзіцячай мастацкай школы № 1 г. Віцебска працавала дабрачынная фотавыстава, якую арганізавалі *Марыя Крупіца* і *Максім Цярэшчанка*.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 19 июня. – С. 16.;

Народнае слова. – 2010. – 19 чэрв. – С. 4.)

26 чэрвеня маладыя віцебскія мастакі *Андрэй Духоўнікаў*, *Алена Чуйкова*, *Аляксандр Вышка* на сцяне будынка былога Віцебскага пазямельнага банка ўзнавілі роспіс па эскізу К. Малевіча “Смерць обоям”.

(Витебский проспект. – 2010. – 1 июля. – С. 23.)

Арт-цэнтр М. Шагала наладзіў прэзентацыю кнігі “Мастакі Парыжскай школы з Беларусі”. Выданне прадстаўляў сам аўтар – пасол па асабых даручэннях Міністэрства замежных спраў Беларусі, старшыня Нацыянальнай камісіі РБ па справах ЮНЕСКА *Уладзімір Шчасны*.

(Народнае слова. – 2010. – 10 чэрв. – С. 15.;

Витебский проспект. – 2010. – 10 июня. – С. 6.)

У чэрвені ў адным з залаў Мастацкага музея г. Віцебска адкрылася выстава жывапісу *Аляксея Пшонкі* “Размышления на тему”,

МАСТАЦТВА

- **ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА**

4 чэрвеня беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны *Аляксандр Салаўёў* падараваў Віцебскаму мастацкаму музею 35 сваіх работ. У дароўнай калекцыі прысутнічаюць абстрактныя кампазіцыі і эскізы афармленых дэкарацый да тэатральных пастановак, створаных мастаком для розных тэатраў.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 8 июня. – С. 2.;

Витебский проспект. – 2010. – 10 июня. – С. 4.)

З **19** мая па **9 чэрвеня** ў Цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў "Дзвіна" была арганізавана мастацкая выстава "Встречи без границ" *Эвелін Роса* (Германія).

(Віцебскі АМЦНТ)

10-12 чэрвеня навучэнцы Навазыбкаўскай школы (Бранская вобласць) прынялі ўдзел у адкрытым рэгіянальным пленэры, прысвечаным 200-годдзю з дня нараджэння І.Ф. Хруцкага, які адбыўся ў Наваполацку.

(Віцебскі АМЦНТ;

Витебский проспект. – 2010. – 17 июня. – С. 23.)

11 чэрвеня ў Мастацкім музеі г. Віцебска адкрылася выстава мастака *Андрэя Духоўнікава* пад назвай "Графіка".

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 15 июня. – С. 2.;

Витебский проспект. – 2010. – 17 июня. – С. 23.)

16 чэрвеня ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі пачала экспанавацца выстава "Виза на жизнь. Дипломаты, которые спасали евреев", падрыхтаваная Пасольствам Ізраіля ў Рэспубліцы Беларусь. У адкрыцці выставы прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол

дзяржаўнага інстытута мастацтваў (Расія), народны фальклорны калектыў "Чырвона каліна" г. Нежын Чарнігаўскай вобласці (Украіна).

(Віцебскі АМЦНТ;

Народнае слова. – 2010. – 24 чэрв. – С. 9.;

Витебский проспект. – 2010. – 17 июня. – С. 2.)

У Паставах прайшоў дзіцячы фестываль **"Пастаўская зорачка"**, ініцыятарам і арганізатарам якога стаў раённы Дом культуры.

(Пастаўскі край. – 2010. – 12 чэрв. – С. 5.)

- **САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ**

З **4** па **13 чэрвеня** ў рамках абласной дэкады тэатральнага мастацтва "Аматарскі тэатр ў першым дзесяцігоддзі XXI стагоддзя" ў цэнтральных Дамах культуры аграгарадкоў вобласці выступілі 13 народных аматарскіх тэатраў. Завяршылася тэатральная дэкада **11-13 чэрвеня** абласным святам аматарскіх тэатраў **"Тэатральная вясна-2010"**. Званне лаўрэата прысуджана народнаму тэатральнаму калектыву Палаца культуры Аршанскага льнокамбіната (рэжысёр Генадзь Юмаў).

(Віцебскі АМЦНТ;

Герой працы (Шуміліна). – 2010. – 11 чэрв. – С. 4.;

Рэжым доступу:

http://vitebsk-region.gov.by/ru/news/culture?mode=one_new&id=3818. –

Дата доступу: 01.07.2010 г.)

13 чэрвеня ў весцы Перабродцзе Міёрскага раёна праводзілася свята народнай творчасці **"Перабродская зорка"**. На цэнтральнай плошчы вёскі размясціліся экспазіцыі клуба майстроў "Святліца" Міёрскага РДК, Дзісненскага гарадскога Дома рамёстваў, народных майстроў Я.Н. Ліпатавай з в. Перабродцзе, Ф.К. Шугальскай, А.С. Стаўскай з в. Завуцце. У мастацкай праграме свята прымалі ўдзел фалькорны калектыў Язненскага СДК "Язынка", ансамбль народных інструментаў "Павятчанка", калектыў мастацкай самадзейнасці з Перабродскага СДК.

(аддзел культуры Міёрскага райвыканкама)

20 чэрвеня ў Гарадку прайшло свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклора **“Вераніцынскі фэст”**, прысвечанае ўраджэнцу Гарадоцкай зямлі, аўтару вядомай паэмы “Тарас на Парнасе” Канстанціну Вераніцыну. У рамках свята арганізатары правялі заключны канцэрт пераможцаў раённага агляду-конкурсу “Гарадоцкая скарбонка-2010”.

(Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 19 июня. – С. 4;

Народнае слова. – 2010. – 22 чэрв. – С. 8.;

Витебский проспект. – 2010. – 1 июля. – С. 23.;

Гарадоцкі веснік. – 2010. – 19 чэрв. – С. 8.)

У Мінску адбыўся традыцыйны рэспубліканскі фестываль-кірмаш рамёстваў “Веснавы букет”, разнастайная праграма якога прадугледжвала і конкурс майстроў з розных куткоў краіны. Прызёрамі фестывалю сталі *Марына Гушча* з Гарадка (ткацтва), *Таццяна Марціновіч* з Докшыц (саломапляценне), *Іван Плыгаўка* з Докшыц (разьбярства). Майстар апрацоўкі скуры *Ігар Яўсціхаў* з Віцебскага раёна, віцяблянкі *Любоў Трыгубенкава* (ткацтва паясоў) і *Ларыса Казачонак* (выцінанка) таксама сталі пераможцамі конкурсу.

(Народнае слова. – 2010. – 3 чэрв. – С. 1.)

Выставачная зала раённага Дома рамёстваў запрасіла на выставу глыбачанкі *Марыі Яловік* “Вышываю для душы”.

(Веснік Глыбоччыны. – 2010. – 23 чэрв. – С. 2.)

Раённы Цэнтр народных рамёстваў “Адраджэнне” пас. Акцябрскі Віцебскага раёна) правёў тэатралізаванае прадстаўленне, азнаменаванае адкрыццём III пленэра ганчароў “Гліна спявае”, у якім прынялі ўдзел народныя ўмельцы з Віцебска, Наваполацка, Бешанковіч, Навалукамля і Віцебскага раёна.

(Жыццё Прыдзвіння. – 2010. – 22 чэрв. – С. 3.)

Лепельскі народны тэатр “Пошук” выступіў з чарговай прэм’ерай. Рэжысёр *Віталь Хватынец* паставіў спектакль па п’есе Алены Паповай

- **МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ**

25 чэрвеня ў г. Віцебску была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар легендарнага камандуючага ПДВ генерала *Васілія Маргелава*.

(Народнае слова. – 2010. – 29 чэрв. – С. 2.;

Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 3.)

25 чэрвеня адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця парку Партызанскай славы музея М.Ф. Шмырова і выставы, прысвечанай ганароваму грамадзяніну г. Віцебска, удзельніку партызанскага руху на Віцебшчыне, генерал-лейтэнанту ў адстаўцы *Добрыну Дзімітраву*.

(Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 4.)

25 чэрвеня пры ўездзе ў пас. Тулава быў адкрыты памятны знак вязням віцебскага гета.

(*Витебский проспект. – 2010. – 1 июля. – С.2.)*

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адбылася сустрэча з *Міхаілам Андрэевічам Каральковым*, адным з тых 118 чалавек, што сустракалі савецкіх салдат у вызваленым Віцебску 26 чэрвеня 1944 года.

(Народнае слова. – 2010. – 26 чэрв. – С. 3.)

У чэрвені закрыты на рэстаўрацыю Полацкі Сафійскі сабор.

(Рэжым доступу:

http://vitebsk-region.gov.by/ru/news/culture?mode=one_new&id=3809. –

Дата доступу: 01.07.2010 г.)

Рэчы, прывезеныя ў Полацк з розных куткоў свету, можна ўбачыць на выставе “Гандлёвыя сувязі Полацка ў X-XVI стст.” у Полацкім краязнаўчым музеі.

(*Витебский проспект. – 2010. – 24 июня. – С. 23)*

крыніцы” - Вялікадолецкая бібліятэка-філіял, гадзіну паэзіі “Не буду я стаяць на раздарожжы…” - Градзянецкая бібліятэка-філіял.

Чэрвень быў насычаны мерапрыемствамі эколага-краязнаўчага характару, прысвечанымі Сусветнаму дню аховы навакольнага асяроддзя. Бібліятэкамі былі праведены эколага-краязнаўчая гульня “Сцежкамі роднага краю” (Глыбачанская бібліятэка-філіял), інтэлектуальнае спаборніцтва “Природы храм” (Старасельская бібліятэка-філіял), экалагічны ўрок “Защищай! Береги! Умножай!”, экалагічны конкурс “Дом, где мы живем” (Слабадская бібліятэка-клуб).

ШУМІЛІНСКАЯ ЦБС

На працягу чэрвеня аддзелам бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі і дзіцячай бібліятэкай быў праведзены цыкл выязных мерапрыемстваў для дзяцей у летніх школьных лагерах. Так, былі праведзены забаўляльныя і гульнявыя праграмы, як “Любознательные почемучки”, “Путешествие в страну почемучек”, “Последний герой”, якія прайшлі ў Башнеўскай, Мікалаеўскай, Мішневіцкай бібліятэках.

5 чэрвеня ў Светласельскай бібліятэцы прайшла конкурсна-гульнявая праграма “Веселые соревнования”.

23 чэрвеня Шумілінскі раён адзначаў 66-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Не засталася ў баку і народная літаратурна-музычная гасціная “Крыніца”. Сумесна з раённым Саветам ветэранаў яна падрыхтавала тэматычную сустрэчу “Победа - в строю поколений”, на якую былі запрошаны ветэраны вайны, удзельнікі партызанскай брыгады імя С. Кароткіна, школьнікі. У рамках мерапрыемства былі падведзены вынікі конкурсу творчых работ “Ветэран жыве побач”. Лепшыя работы, прадстаўленыя ў чытальнай зале, былі адзначаны граматамі раённага Савета ветэранаў.

“Бліндаж”.

(Лепельскі край. – 2010. – 11 чэрв. – С. 7.)

- **БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА**

ВІЦЕБСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦБС

1 чэрвеня ў бібліятэцы імя М. Лынькова прайшло свята кнігі “Я - ребёнок, я - человек!”, прымеркаванае да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

1 чэрвеня бібліятэка імя Я. Коласа запрасіла на гістарычнае падарожжа “Заступніца зямлі Беларускай”, прысвечанае памяці Еўфрасінні Полацкай.

3 чэрвеня адбылося ўрачыстае адкрыццё новага памяшкання дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага. У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел прадстаўнікі органаў улады, чытачы дзіцячай бібліятэкі, члены клуба “Востраў надзеі”, узорны духавы аркестр школы мастацтваў № 2, супрацоўнікі бібліятэк горада.

(Рэжым доступу: http://libsystem.vitebsk.ws/. –
Дата доступу: 01.07.2010 г.;
Віцьбічы=Витьбичи. – 2010. – 5 июня. – С. 3.;
Віцебскі рабочы. – 2010. – 15 чэрв. – С. 5.)

3 чэрвеня ў бібліятэцы імя І. Крылова сярод членаў клуба “Лідэр” адбыўся камунікатыўны трэнінг “Урокі ўзаемаразумення”.

4 чэрвеня бібліятэкай імя Я. Купалы праведзена вечарына памяці Еўфрасінні Полацкай “Імя вялікае і славутае”.

10 чэрвеня інфармацыйна-пазнавальную гульню “Кожны мае права” падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі імя І. Крылова

15 чэрвеня ў бібліятэцы імя Я. Маўра адбылася гадзіна паэзіі “Мы лёс свой выбіраем самі”, прысвечаная творчасці П. Броўкі.

ПОЛАЦКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦБС

1 чэрвеня ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень абароны

дзяцей. З гэтай нагоды бібліятэка імя Л. Талстога запрасіла сваіх маленькіх чытачоў на тэатралізаванае свята “Есть на планете народ веселый – Дети!”.

5 чэрвеня да Дня ўшанавання Еўфрасінні Полацкай у бібліятэках горада быў праведзены шэраг мерапрыемстваў: гадзіна мастацтва “Ззяе святлом праз цемру вякоў святое імя Еўфрасінні” (дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога), гадзіна гісторыі “Яко луча солнечныя” (бібліятэка імя А. Герцэна), гутарка-віктарына “Небесная покровительница Беларуси” (дзіцячая бібліятэка-філіял № 7), музычная кампазіцыя “Птушка белая па-над краем сінім” (бібліятэка імя Я. Купалы).

АРШАНСКАЯ ЦБС

18 чэрвеня ў Бабініцкай бібліятэцы адбыўся экалагічны рынг “Што? Дзе? Калі?”, а **25 чэрвеня** – лялечны спектакль “Путешествие в страну Светофорию”.

(Аршанская газета. – 2010. – 15 чэрв. – С. 2.)

БРАСЛАЎСКАЯ ЦБС

У чэрвені ў раённай бібліятэцы працягвалася работа ў рамках “Святочнага экспрэса”, прымеркаванага да 945-годдзя г. Браслава. Карыстальнікі адказвалі на пытанні віктарыны “Чым больш ведаю, тым больш ганаруся” і прымалі ўдзел у акцыі “Пажаданні нашаму гораду”.

Працягвалі сваю работу клубы па інтарэсах. На пасяджэнні аматарскага аб’яднання “Кругагляд” Відзаўскай гарпасялковай бібліятэкі адбылося знаёмства чытачоў з творчасцю італьянскага мастака Мікеланджала Буанароці “Мгновение, остановленное навек”. У Зарачскай бібліятэцы на пасяджэнні клуба для жанчын “Субяседніца” была праведзена гадзіна міласэрнасці “Чалавек народжаны для добрых спраў”, дзе ўдзельніцы клуба пазнаёміліся з жыццём і дзейнасцю Еўфрасінні Полацкай, Маці Тэрэзы, Серафіма Сароўскага. Творчасці паэтэсы Р. Баравіковай была прысвечана літаратурна–паэтычная вечарына “Душою

гавару” клуба “Гаспадыня” Краснагорскай бібліятэкі.

ПОЛАЦКАЯ ЦБС

Да Міжнароднага дня абароны дзяцей ў бібліятэках Полацкай РЦБС былі праведзены наступныя мерапрыемствы: літаратурна-пазнавальная гульня “Твае правы” (Гомельская бібліятэка-філіял № 23, Багатырская бібліятэка-філіял № 48), круглы стол “Подари детям свою любовь” (Руднянская бібліятэка-філіял № 43), агляд літаратуры “Правы дзяцей і будучыня краіны” (Полацкая ЦБ, Маласітнянская бібліятэка-філіял № 35) і інш.

Дзень памяці Еўфрасінні Полацкай быў адзначаны інфармацыйнай гадзінай “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у літаратуры і мастацтве” (Полацкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1, Ветрынская гарпасялковая бібліятэка-філіял № 2), гутаркамі “Унучка Чарадзея” (Шпакоўшчынская бібліятэка-клуб), “Нябесная апякунка Беларусі” (Фарынаўская бібліятэка-філіял № 22).

УШАЦКАЯ ЦБС

29 чэрвеня ў цэнтральнай раённай бібліятэцы быў праведзены семінар творчага майстэрства “Масавая работа ў бібліятэцы. Інавацыйныя формы і метады”, падчас якога бібліятэкары бібліятэк-філіялаў атрымалі метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і правядзенні масавых мерапрыемстваў, выкарыстанні інавацыйных форм і метадаў работы.

У чэрвені ў бібліятэках сістэмы адзначалася 105-годдзе з дня нараджэння паэта-земляка Петруся Броўкі. Цэнтральная раённая бібліятэка падрыхтавала і правяла раённае мерапрыемства – літаратурнае свята “Чалавек вялікага сэрца” на радзіме паэта ў в. Пуцілкавічы, а таксама літаратурна-краязнаўчую віктарыну з выкарыстаннем слайд-шоў “Пятрусь Броўка і Ушаччына”. Агляд па творчасці П. Броўкі “Асноўныя матывы і вобразы творчасці П. Броўкі” правяла Слабадская бібліятэка-клуб, літаратурна-музычную кампазіцыю “Мне з-пад Ушачы званілі